«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Максіма Вінярскага, Вольгу Нікалайчык і Леаніда Кулакова пакаралі штрафамі

21.05.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, затрыманні



Максім Вінярскі.

У Смалявіцкім раённым судзе завяршыўся адміністрацыйны працэс над актывістам «Еўрапейскай Беларусі» Максімам Вінярскім, якога абвінавачвалі у абразе супрацоўніка мясцовай міліцыі (арт 23.5 КаАП РБ).

Суддзя **Ліна Бародзіч** пакарала актывіста штрафам у памеры 30 базавых велічынь.


Як паведаміла ў facebook Юля Сцяпанава, у Смалявічах была затрыманая рэжысёр **Вольга Нікалайчык**, якая прыехала падтрымаць Вінярскага ў судзе. Вольгу затрымаў намеснік начальніка Смалявічскага РУУС. Па меркаванні актывіста Леаніда Кулакова, Нікалайчык затрыманая за акцыю на Кургане Славы. Дарэчы, актывістка **Вольга Нікалайчык** і **Кацярына Садоўская** атрымалі позвы з Цэнтральнага раённага суду Менску. На 26 траўня іх выклікаюць у суд за акцыю, якая прайшла каля расейскай амбасады 29 красавіка. Таксама затрыманы **Леанід Кулакоў**.

На Вольгу Нікалайчык склалі адміністратыўны пратакол па частцы 2 артыкула 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве) і пакаралі штрафам у памеры 30 базавых велічынь, Леаніда Кулакова пакаралі за парушэнне правілаў дарожнага руху на 180 тысяч рублёў. Суддзя - **Казлоўскі.**

Нагадаем, што паводле пратаколу, які быў складзены на Вінярскага 15 траўня, ён назваў «упыром» міліцыянта Лесіцу. Інцыдэнт адбыўся, калі актывісты, у тым ліку Вінярскі, прыехалі да Смалявіцкага РУУС, каб сустрэць пасля адбыцця арышту свайго аднадумца Леаніда Кулакова. 20 траўня міліцыянт **Лесіца** ў суд не з'явіўся. З гэтай прычыны суд быў перанесены на наступны дзень.

Опубликовать






ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы


"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Жыццё ў пенітэнцыярных установах грунтуецца на гвалце". Праваабаронца "Вясны" — на Стакгольмскай канферэнцыі па Беларусі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Амністыя-2024: у гонар вызвалення Беларусі без вызвалення палітычных вязняў

"Мы тут, бо так кажуць нашыя сэрцы": акцыя салідарнасці з палітзняволеным адвакатам Максімам Знакам (фота)

Дзянісу Дзікуну дадалі 2 калоніі па новай крымінальнай справе. Ён падаў апеляцыйную скаргу

Вынікі першага дзесяцігоддзя новага этапу сусветнай барацьбы з прымусовай працай. Досвед Беларусі і яе бліжэйшых суседзяў

Супрацоўнікаў санаторыя "Беларусь" асудзілі за "агентурную дзейнасць" і "здраду дзяржаве" (дапоўнена)

Крама "Князь Вітаўт" – "экстрэмісцкая", 7 сутак за татуіроўку з "Пагоняй": хроніка пераследу 11 чэрвеня


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024



Выбары*2024





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

